ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 09 2016 г.

Акордамі душы

# Нью-эйдж для скрыпкі,

## ці Магія са смычком



**Студэнты музычнага каледжа імя М.І. Глінкі стварылі інструментальны бойз-бэнд «DANAND». Хлопцы іграюць у стылі нью-эйдж, які спалучае элементы электроннай і этнічнай музыкі. Гэта меладычныя, нетанцавальныя кампазіцыі з рознымі відамі аранжыровак. Сёння групу складаюць два скрыпачы, але надалей яна будзе пашырацца. Даніїл КУЛІКОЎСКІХ, кампазітар і ідэйны натхняльнік групы, расказаў «Чырвонцы. Чырвонай змене» пра сваё захапленне і творчыя планы.**

— Схільнасць да музыкі заўважыла ўва мне маці, калі я «наіграваў» нешта на алоўках, пераймаючы манеры скрыпача. Для музычнай школы я быў яшчэ замалы, таму прынялі рашэнне браць прыватныя ўрокі. Калі мне споўнілася шэсць гадоў, я змог працягнуць навучанне ў спецыялізаванай установе. У гэты ж перыяд напісаў свой першы музычны твор. Часу катастрафічна не хапала: з адной школы прыходзілася бегчы ў другую, хапаючы на хаду прадбачліва прыгатаваную мамай ссабойку. А вечарам, стомлены, я прaходзіў каля разгарачанай ад гульняў дзятвы і праклінаў усё на свеце. На шчасце, побач заўсёды былі бацькі, якія знаходзілі патрэбныя словы падтрымкі, што надавалі сілы ісці далей.

***— Што для цябе з'яўляецца крыніцай натхнення?***

— Я чую музыку паўсюдна. Магу проста ісці па вуліцы, пачуць стук абцасаў і ў галаве нараджаецца мелодыя. А потым еду ў аўтобусе і занатоўваю. Я лічу, што натхненне — гэта ўменне бачыць у чарадзе дзён магію жыцця. І гэтаму трэба вучыцца. Кожны дзень мы становімся сведкамі цудаў, але шукаем іншых дэкарацый для шчасця. Натхненне — у простых рэчах. У шалясценні травы, промнях сонца, форме аблокаў, а яшчэ... у сустрэтых людзях.

***— Калі прыйшло разуменне, што тое, чым займаешся, цікава не толькі табе, але і іншым?***

— Неяк у мастацкім музеі мы рэпетыравалі праграму да дабрачыннага канцэрта. Кіраўніцтва выдзеліла нам адзін з адкрытых балконаў. Калі паліліся першыя гукі музыкі, да таго месца стаў падцягвацца народ і скончылася ўсё невялікім міні-канцэртам, нам апладзіравалі. Час ад часу мы з сябрамі граем у падземных пераходах. Не дзеля заробку, не, хутчэй для душы. Людзі падыходзяць да нас, цікавяцца стылем музыкі, выказваюць задавальненне.

***— Чыя творчасць блізкая табе па духу?***

— Мяне захапляе Ханс Цімер — выдатны кампазітар сучаснасці, які напісаў саўндтрэкі да такіх фільмаў, як «Чалавек дажджу», «12 гадоў рабства» і іншых. Я планую развівацца ў тым жа кірунку. Нядрэнную музыку піша фінская група «Апакаліпціка», якая выконвае «метал» на віяланчэлях. Наогул, я стараюся як мага менш... слухаць музыку. Былі сітуацыі, калі ў галаве кружылася пэўная мелодыя, мне здавалася, што яна мая, а аказвалася, што такое ўжо ёсць у іншага аўтара.

> «Я чую музыку паўсюдна. Магу проста ісці па вуліцы, пачуць стук абцасаў і ў галаве нараджаецца мелодыя. А потым еду ў аўтобусе і занатоўваю».

***— Раскажы пра свой вопыт кампазітара?***

— Цяпер я выступаю ў асноўным як выканаўца, але ж хацелася больш часу прысвячаць складанню музыкі. Гэтая цяга да напісання ўласных твораў у многім стала вызначальнай для мяне. Так, распаўся гурт «EVAND» — маё першае дзецішча, якое праіснавала ўсяго год, бо не сышоўся ў поглядах на творчасць з іншымі ўдзельнікамі. Яны хацелі рабіць кавер-музыку (выконваць існуючыя кампазіцыі на новы лад), якая больш прыбытковая ў грашовым плане, але істотна абмяжоўвае магчымасці творцы.

***— Над чым ты зараз працуеш?***

— Разам з маім калегам Андрэем Ходасам, другім удзельнікам групы, я запісваю свой першы аўтарскі альбом, у які ўвойдуць дзевяць кампазіцый. Адну з іх я напісаў ва ўзросце 12 гадоў. А ўсяго іх у мяне каля 150. Некаторыя былі ўзяты ў рэпертуар нашага студэнцкага аркестра. Нядаўна на мяне выйшла расійская спявачка, якая папрасіла напісаць музыку да яе песні. А яшчэ працую над агучваннем спектакля «Крылы адны» ў псіхалагічным тэатры «Лютэя».

***— Ці былі ў вас ужо гастролі?***

— Падчас навагодніх свят мы выступалі ў Рызе на прыватных вечарынках. Ёсць магчымасць выхаду на замежныя эксперыментальныя музычныя пляцоўкі, таму будзем старацца заявіць пра сябе і там.

**Алена ЯКАВЕНКА.**

Камертон настрою

# Загадка «электроннай прынцэсы»

**Музыка Mustelide гучыць і ў Маскве, і ў Нью-Ёрку. За гэтым псеўданімам хаваецца Наталля КУНІЦКАЯ, якая сёлета выпусціла новы альбом і аб'ездзіла з канцэртамі амаль паўсвету. Свой сольны праект яна пачала некалькі гадоў таму і амаль адразу атрымала тытул «Электроннай прынцэсы Беларусі».**



***— Як вы да яго ставіцеся?***

— З гумарам. Сама б сябе я так, вядома, не назвала — гучыць пафасна і нясціпла. Узнагародзілі мяне гэтым тытулам хлопцы з суполкі беларускай электроннай музыкі «Grave Board Clan», а іншыя СМІ падхапілі.

***— Сёлета выйшаў новы альбом «Spi». Чым ён адрозніваецца ад папярэдняга «Secret»?***

— У першую чаргу ў падыходзе да работы над гукам. У мяне з'явілася больш вопыту і смеласці, захацелася выйсці за рамкі і даць волю падсвядомасці. Таму гэтую музыку можна параўнаць са снамі, непрадказальнымі і, магчыма, вар'яцкімі. Але песні напісаныя не для таго, каб збегчы ад штодзённасці, яны, хутчэй, дапамагаюць зірнуць на звыклыя рэчы па-іншаму. Гэта быццам «музычныя рэчывы», якія не шкодзяць здароўю, але змяняюць свядомасць.

***— Адкуль з'явілася ідэя зняць відэа на загалоўную песню з дзіцячымі кашмарамі?***

— Генератар усіх ідэй кліпа — яго рэжысёр Віталь Сідарук. Гэты таленавіты аніматар славіцца сваёй любоўю да ўсяго жудаснага. У, здавалася б, мяккай і наіўнай песні «Spi» ён разгледзеў гэтакі цёмны бок і вырашыў прадставіць яго гледачу.

> «Маю музыку можна назваць стылем «сінтыпух», дзе спалучаецца сінтэтычная жорсткасць і жаноцкая «пушыстасць». Увесь гук атрымліваю з аналагавых сінтэзатараў».

***— З новым альбомам вы адыгралі некалькі канцэртаў у Нью-Ёрку. Як вашу музыку прымалі ў Амерыцы?***

— Нечаканa цёпла. Я заўважыла, што там людзі шчодрыя на кампліменты і актыўныя на водгукі. Таксама радуе, што руская мова маіх песень не адштурхоўвае, а, наадварот, прыцягвае. Штампы ў наш час мала каму цікавыя, а англійская мова — па вялікім рахунку — таксама штамп. Калі людзі чуюць нязвыклае маўленне, і гэта не фолк, а нешта актуальнае, яно прыцягвае нашмат больш цікавасці і ўвагі.

***— А ці можна айчынным выканаўцам вылучыцца на замежнай сцэне, наадварот, за кошт народных матываў?***

— Толькі выкарыстоўваючы народныя элементы — складана. Але калі гэта будзе аб'ектыўна «круты» прадукт з магутным прамоўшэнам, калі ён выдатны і стыльны, то тады зацікавіць і сусветную сцэну. Сам па сабе беларускі фолк мала каму цікавы. Цяпер вітаецца максімальная інтэграцыя: народныя матывы павінны пісьменна спалучацца з сусветнымі тэндэнцыямі.

***— Да якога стылю вы адносіце сваю творчасць? У музыкі незвычайнае гучанне. Як запісваеце свае песні?***

— Маю музыку можна назваць стылем «сінтыпух», дзе спалучаецца сінтэтычная жорсткасць і жаноцкая «пушыстасць». Увесь гук атрымліваю з аналагавых сінтэзатараў. Мой любімы — гэта «Prophet'08». У яго вельмі харызматычнае гучанне, усё на ім можна сінтэзаваць самастойна, дамагаючыся тым самым унікальнага саўнда. А запісваю і зводжу потым у праграме «Ableton».

***— У выступленнях вы выкарыстоўваеце шмат візуальных эфектаў...***

— У маім выпадку гэта вельмі важны элемент. Але я яшчэ працую над візуальным шоу. Тое, што паказваю цяпер, рабіла самастойна або з дапамогай сяброў.

***— І запісам, і прасоўваннем праекта таксама займаецеся самі?***

— Прадукт ствараю ў адзіночку. Мне так больш зручна і цікава. Сёння гэтую частку працы артыст можа выконваць сам. Наяўнасць у камандзе менеджара становіцца лагічнай, калі запатрабаванасць і, адпаведна, занятасць выканаўцы расце. Мяне патрэбна дапамога, каб заставаўся час на музыку. Менавіта таму, пачынаючы з выхаду другога альбома, з менеджментам, букінгам і прома мне сталі дапамагаць прадстаўнікі лэйбла «SunWoofer» Аляксандр Бергер і Яўген Калмыкоў.

***— У чым сакрэт псеўданіма Mustelide?***

— Тут зашыфравана некалькі сэнсаў, адгадаць якія — задача маіх слухачоў. Я люблю загадкі.

***— Калі вас чакаць з канцэртам на радзіме?***

— У Беларусі часта іграць не атрымліваецца з-за маіх пастаянных раз'ездаў. Але я планую восенню зладзіць вялікі канцэрт у Мінску.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

Роля з жыцця

# «ЭКСПЕРЫМЕНТ»: СЫГРАЦЬ САМІХ СЯБЕ

**Выхаванцы мінскай дзіцячай школы тэлевізійнага майстэрства і журналістыкі пры «Тэлестудыі Новы горад» зняліся ў кароткаметражным фільме «Эксперымент». Карціна прысвечана праблеме залежнасці падрастаючага пакалення ад тэхналагічных і камп'ютарных навінак. Сюжэт пабудаваны на аснове матэрыялаў рэальнага эксперыменту, праведзенага псіхолагамі Санкт-Пецярбурга. Сцэнарый да фільма напісала член Саюза кінематаграфістаў, выкладчык Акадэміі мастацтваў Алена Турава.**



Падчас здымак.

...Удзельнікам выпрабавання было прапанавана правесці восем гадзін у адзіноце, самнасам з сабой, не карыстаючыся інтэрнэтам, тэлефонам, не ўключаючы камп'ютар або іншыя гаджэты, а таксама радыё і тэлевізар. Усе астатнія заняткі — чытанне, маляванне, музіцыраванне, прагулкі — дазваляліся. Пры з'яўленні сімптомаў трывожнасці, страху, млоснасці неабходна было спыніць эксперымент і зафіксаваць свае адчуванні на камеру. З сямі чалавек да канца дайшоў толькі адзін, ды і той выпадкова — захрас у ліфце. А само заданне, якое здавалася лёгкім, праз пэўны час уводзіла дзяцей у стан панікі. Яны пачынаюць разумець, якую глабальную ролю адыгрываюць у іх жыцці тэхнічныя прылады і як дрэнна яны ведаюць самых сябе.

— Сёння мы назіраем адрываннасць нашых дзяцей ад рэальнага свету. Ім цяжка ісці на кантакт з аднагодкамі, планаваць свой час. Калі нас раней было і пугай не загнаць у дом, так весела было бавіць час у двары ў кампаніі іншых дзяцей, дык зараз мы назіраем адваротную сітуацыю. Даводзіцца прыдумляць нагоду дзеля таго, каб выправадзіць дзіця з кватэры. Даступнасць інфармацыі негатыўна адбіваецца на памяці школьнікаў. Яны не зацікаўлены ў пошуку дакладных звестак, а проста націскаюць на кнопку «мышкі» і адразу маюць адказ, — лічыць **Людміла КАНАПЛЯНІК, дырэктар «Тэлестудыі Новы горад».**

З юнымі акцёрамі працавалі таленавітыя педагогі і майстры сваёй справы — Алена Турава, Ірына Клёнава (вядучая на радыё «Мір»), Іван Пінігін (рэжысёр і тэлепрадзюсар), Ігар Пятроў (акцёр Купалаўскага тэатра) і іншыя.

Выкананы ў жанры ігравога кіно, праект стаў міжнародным. У здымках фільма прынялі ўдзел маскоўскі псіхолаг Міхаіл Казлоў і французская актрыса Дальфін Аэртон. На апошнюю выйшаў ужо згаданы Ігар Пятроў, які курыруе групу французскіх акцёраў-стажораў на базе тэатра Янкі Купалы.

Здымкі доўжыліся пяць дзён, рабочая змена была па 12 гадзін, але гэты этап ужо пройдзены. Наперадзе мантаж, графіка, гуказапіс.

У планах каманды энтузіястаў — прэзентацыя фільма ў эфіры беларускага тэлебачання (каналы «Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3») і на міжнародных фестывалях у Чэхіі, Вялікабрытаніі, Італіі, у наступным годзе — у Чыкага. Летась з відэаролікам «Ачысцім планету ад смецця» (на Youtube запушчаны канал «Pro ekran», дзе можна паглядзець усе работы тэлестудыі) выхаванцы тэлешколы занялі першае месца на экалагічным фестывалі ў Браціславе (Славакія) у намінацыі «Дзіцячае і юнацкае кіно».

— У фільме мне выпала роля Ганны, — **расказвае 13-гадовая актрыса Вераніка ШЫЛКОЎСКАЯ.** — Не зважаючы на захламленасць уласнага пакоя, дзяўчына днямі ўглядаецца толькі ў экраны гаджэтаў. Пагаджаючыся на ўдзел у эксперыменце, яна плануе правесці ў належны выгляд асабістае памяшканне, што ўяўляецца ёй вельмі простым. Але ўжо ў першую гадзіну выпрабавання дзяўчыну ахоплівае трывога, пачуццё бездапаможнасці і крыўды. Яна пачынае «заядаць» уласныя перажыванні. Для мяне гэта была самая цяжкая і адначасова камічная сцэна. Патрэбна было паказаць сапраўднае абжорства, ежу даводзілася літаральна запіхваць у сябе.

**Алена ЯКАВЕНКА.**

***ДАВЕДКА***

***У эксперыменце, які праводзілі санкт-пецярбургскія псіхолагі, прынялі ўдзел 68 падлеткаў ва ўзросце ад 12 да 18 гадоў: 31 хлопчык і 37 дзяўчынак. Давялі эксперымент да канца (гэта значыцца, восем гадзін прабылі сам-насам з сабой) толькі трое падлеткаў: два хлопчыкі і дзяўчынка. Сямёра вытрымалі пяць (і больш) гадзін. Астатнія — менш. Прычыны спынення эксперыменту падлеткі патлумачылі наступным чынам: «Я больш не мог», «Мне здавалася, што я зараз выбухну», «У мяне галава лопне». У дваццаці дзяўчынак і сямі хлопчыкаў назіраліся прамыя вегетатыўныя сімптомы: прылівы жару або дрыжыкі, галавакружэнне, млоснасць, сухасць у роце, трэмар рук ці вуснаў, боль у жываце ці грудзях, адчуванне «варушэння» валасоў на галаве.***